**Добраахвотнае страхаванне медыцынскіх расходаў — вось што павінна быць сёння ў сацыяльным пакеце арганізацый і прадпрыемстваў, якія клапоцяцца пра сваіх работнікаў і эфектыўнасць сваёй дзейнасці.**

БЕЛЭКСІМГАРАНТ
EXIMGARANT OF BELARUS

# Медыцынскае страхаванне: ВЫГАДНА І ЗРУЧНА

Гэта сапраўды цывілізаваны падыход да арганізацыі вытворчага працэсу. За прымальную плату медыцынскае страхаванне дазваляе атрымаць важкія перавагі — вялікі пералік медыцынскіх паслуг і ўстаноў аховы здароўя, а таксама вызвалены час на пошук гэтых паслуг і ўстаноў, што ў сучасных умовах з'яўляецца неверагодна зручным і камфортным.

«Да паслуг работніка, застрахаванага сваім прадпрыемствам такім чынам, — 150 медыцынскіх устаноў толькі ў Мінску, каля 400 — у цэлым па краіне, — адзначае **начальнік аддзела медыцынскага суправаджэння Белэксімгарант Наталля ШАФАЛОВІЧ.** — Вось і першы важны плюс для тых, хто часта бывае ў камандзіроўках па краіне. Што б ні здарылася са здароўем застрахаванай асобы ўдалечыні ад месца пражывання, паслуга гарантавана: застрахаваны ў поўным аб'ёме атрымае медыцынскую дапамогу.

Разам з тым шырокі пералік медустаноў, што прапануюцца, дазваляе перастаць хвалявацца аб наяўнасці ў паліклініцы па месцы жыхарства таго ці іншага профільнага спецыяліста або дыягнастычнага абследавання — мы дапаможам трапіць да яго ў іншай установе».

Можна выбраць такую праграму, дзе будуць прадстаўлены толькі дзяржаўныя ўстановы аховы здароўя, або як дзяржаўныя, так і камерцыйныя. Базавыя праграмы прадугледжваюць таксама магчымасці атрымання толькі амбулаторна-паліклінічнай дапамогі або комплексны варыянт, які прадугледжвае атрыманне як амбулаторна-паліклінічнай дапамогі, так і стацыянарнай.

Добраахвотнае страхаванне медыцынскіх расходаў будзе зручным не толькі ў выпадку сітуацый, якія нельга прадбачыць — пры вострых захворваннях, але і пры наяўнасці хранічных станаў, якія патрабуюць перыядычнага абследавання, лячэння або рэабілітацыі. Нягледзячы на тое, што наймальнік аплаціў за свайго работніка прымальны страхавы ўзнос, апошні цягам усяго года мае магчымасць атрымліваць медыцынскія паслугі, кошт якіх можа перавысіць страхавы ўзнос.

«Гэта азначае, што чалавеку пры наяўнасці пэўных паказанняў становяцца даступнымі ў тым ліку і вельмі дарагія метады абследавання, — адзначае **вядучы спецыяліст аддзела рэгулявання страт Белэксімгарант Вольга ГАЎРЫЛЬЧЫК.** — Не сакрэт, што кошт некаторых відаў абследавання, такіх як камп'ютарная або магнітна-рэзанансная тамаграфія, застаецца досыць высокім. Але са страхавой кампаніяй гэта перастае быць праблемай».

Таксама страхавыя праграмы «Белэксімгаранта» дазваляюць забыцца пры наяўнасці паказанняў на праблему дарагіх лекавых сродкаў. Наогул, калі размова ідзе аб велізарных, часам проста непад'ёмных аднаразовых выплатах за абследаванне, лячэнне або некаторыя віды рэабілітацыі, то няма нічога больш зручнага, чым медстрахоўка.

«Страхавы выпадак — гэта любое парушэнне здароўя, абвастрэнне хранічнага захворвання, узнікненне вострага стану, траўма, — тлумачыць **вядучы спецыяліст аддзела медыцынскага і асабістага страхавання Белэксімгарант Вольга КАШЧЭНКА.** — Застрахаванаму чалавеку неабходна звярнуцца ў нашу кампанію па тэлефоне або электроннай пошце. Наш спецыяліст-урач адразу дае ўсе неабходныя рэкамендацыі. Тлумачыць, у якую з устаноў можна пайсці для вырашэння канкрэтнай праблемы са здароўем. Мы, са свайго боку, накіроўваем у гэтую ўстанову гарантыйнае пісьмо з гарантыяй аплаты пералічаных медыцынскіх паслуг. Гэтае пісьмо можа быць адпраўлена па факсе, электроннай пошце або выдадзена на рукі застрахаванай асобе. Цяпер ад яе патрабуецца дайсці да медустановы, звярнуцца там да спецыяліста-каардынатара, які па нашым званку ўжо запісаў пацыента на прыём, і прад'явіць яму страхавы поліс, імянную картку і пашпарт. Як толькі пацыент атрымаў паслугу, медустанова звязваецца з намі, а сам пацыент ні пра што больш не хвалюецца».

Алгарытм дзеянняў аднолькавы ў выпадках як планавай, так і экстраннай дапамогі, звязанай у тым ліку са шпіталізацыяй. Калі ёсць неабходнасць вызначыцца з аб'ёмам і характарам медыцынскіх даследаванняў, то спачатку застрахаваная асоба можа атрымаць кансультацыю ўчастковага тэрапеўта па месцы жыхарства.


Начальнік аддзела медыцынскага суправаджэння Наталля ШАФАЛОВІЧ і начальнік упраўлення медыцынскага страхавання Вера СТАНЕВІЧ (злева направа).

**Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант»** — дзяржаўная страхавая арганізацыя, заснавальнікам якой з'яўляецца Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, а ўласнікам — Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь.

«Белэксімгарант» займаецца добраахвотным медыцынскім страхаваннем з 2004 года. На працягу гэтых гадоў «Белэксімгарант» займае адну з лідзіруючых пазіцый сярод страхавых кампаній Беларусі на рынку добраахвотнага страхавання медыцынскіх выдаткаў. Сёння ў «Белэксімгарант» застрахавана больш за 37 тысяч чалавек па ўсёй рэспубліцы.

## Зручна для страхавальніка

Паводле заканадаўства, прадпрыемствы-страхавальнікі пры заключэнні дагавора тэрмінам на адзін год маюць магчымасць аднесці страхавыя ўзносы па добраахвотным страхаванні медыцынскіх расходаў на затраты па вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, тавараў, паслуг. Акрамя таго, на сумы страхавых узносаў, уключаных у затраты па вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, не налічваюцца ўзносы па дзяржаўным сацыяльным страхаванні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

## Камфорт — пад кантролем

Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» — адна з самых буйных у краіне дзяржаўных страхавых арганізацый. Філіялы адкрыты ва ўсіх абласных цэнтрах, а таксама ў васьмі буйных гарадах рэспублікі.

— Пасля заключэння дагавора добраахвотнага страхавання медыцынскіх расходаў паміж прадпрыемствам і нашай кампаніяй мы не толькі бяром на сябе пэўныя абавязкі, але і цалкам кантралюем аб'ём, тэрміны і якасць медыцынскіх паслуг, узровень камфорту і сэрвісу пры іх атрыманні, — падкрэслівае **начальнік упраўлення медыцынскага страхавання Белэксімгарант Вера СТАНЕВІЧ.** — Размова пры гэтым ідзе аб магчымасці кругласутачнага звароту, прыёме зваротаў урачамі вышэйшай і першай кваліфікацыйнай катэгорый.


Вядучыя спецыялісты аддзела рэгулявання страт Вольга ГАЎРЫЛЬЧЫК і Жанна ВАЛЬКОВІЧ (злева направа).

**Генеральны дырэктар Белэксімгарант Генадзь МІЦКЕВІЧ:**

— Пятнаццаць гадоў работы кампаніі — наш велізарны ўнёсак у развіццё айчыннага страхавога рынку. Падчас работы з патэнцыяльнымі страхавальнікамі мы трымаемся таго прынцыпу, што нашы дасягненні ёсць вынік не толькі планамернай, паспяховай работы супрацоўнікаў кампаніі, але гэта яшчэ відавочны давер кліентаў. Таму, карыстаючыся святочнай нагодай, дазвольце падзякаваць як усім нашым работнікам, так і тым, хто лічыць нас надзейным партнёрам. Дзякуй, што давяраеце нам з году ў год, і загадзя дзякуй кожнаму, хто пажадае супрацоўнічаць з намі ў будучыні! Нашы спецыялісты адкажуць на любыя вашы пытанні ў любы час.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Надзеі БУЖАН.**

УНП 101421509
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02200/13-00049 на права ажыццяўлення страхавой дзейнасці. Выдадзена Міністэрствам фінансаў РБ. Сапраўдны па 23 красавіка 2018 года.